Бел2
П85

ПЯТРО ПРЫХОДЗЬКА



# не здадзеныя вышыні



Бел2
П85

ПЯТРО ПРЫХОДЗЬКА

# НЕ ЗДАДЗЕНЫЯ ВЫШЫНІ

44426

вершы
і паэма

ХОТИМСКАЯ
РАЙОННАЯ
БИБЛИОТЕКА

■ ■ ■

Пройдзе люты —
Мой старт пажыццёвы,
Прашуміць, як віхор, нада мной.
Позні іней з прамерзшай дубровы
Мае скроні асыпле зімой.

Будзе чэрвень шумець у прысадах
Цёплым ліўнем, апаўшым з нябёс.
Я ж заўсёды ў жыцці буду рады
Тым вятрам,
Што мне вызначыў лёс.

*1971*

## ДЫХАННЕ ВЯСНЫ

Дзесьці вецер наносіць сумёты
У цяснінах, закутках лясных, —
А мне бачны ўжо
Птушак прылёты,
Адчуваю дыханне вясны.

Ручайкамі да рэчак,
Далінай
Адплываюць з узгоркаў снягі...
І вачыма прарослых былінак
Углядаюцца ўвысь берагі.

Красавік над гасцінным парогам
Вее ветрам вясны маладым,
І сваёю адвечнай дарогай
Крочыць сонца па крузе зямным.

Сонцу бачна сцяжынка любая,
Па якой
З веку ў век мы ідзём.
У другое стагоддзе ўступае
Ленін
Бурным планеты жыццём.

*1970*

* * *

Даўно адгрымелі гарматы,
Дубы разрасліся ў лясах.
Сівеюць былыя салдаты,
Як іней на позніх лістах.

Мне май пераможны ў паходзе
Развеяў на сэрцы тугу.
Але ўжо
Больш чвэрткі стагоддзя
Я сябра забыць не магу.

Яму сорак пятае лета
Якраз бы сягоння пайшло...
О як для яго многа кветак
У нас пад акном расцвіло!

Маюе вясна каля хаты,
А я да кургана іду,
Вянок свайму другу-салдату
На брацкай магіле кладу.

*1971*

## СЫНОЎНЯЕ

Даруй мне, маці, што парою
Табе прыносіў шмат турбот,
Што над калыскаю маёю
Не спала ночы напралёт;
Што ў тую бедную калыску
Так многа выплакала сноў,
Калі апошнюю скарынку
Дзяліла між усіх сыноў;
Што я задужа быў плаксівы,
Калі ў цябе на ўлонні рос...
А ты з сярпом ішла на ніву —
Тваіх ніхто не бачыў слёз.
Не помню я, каб хоць аднойчы
Камусь паскардзілася ты.
Твае з усмешкай шчырай вочы
Нас падбадзёрвалі заўжды.
Сягоння — быццам толькі з бою —
Цябе праведаць я прыйшоў.
Стаю адзін перад табою
У ціхай засені бароў.
Даруй за тое, што я ўвосень
Бег болей фарбаў адшукаць,—
Табе ж так часта давялося
Маю кашулю зашываць.

Шмат год замест тае кашулі
Вайсковы кіцель я насіў.
І хоць ён быў прабіты куляй —
Не зашываць яго прасіў.
Табою вышытыя ўзоры
На палатняных ручніках,
Любоў тваю
У шчасці й горы
Я панясу ў далёкі шлях.

*1970*

## ЧАКАЮЧЫ ПАШТОЎКІ...

Адзін я з думкамі сваімі
Сяджу перад святочным днём,
Успомніў тых байцоў, з якімі
Ішоў праз сцюжы пад агнём.

Сяброў, прызнацца, маю многа —
Сумленных, добрых і благіх.
Чамусьці ж дальняя дарога
Мне не нясе паштовак іх.

Ды не паспела у кватэру
Прынесці елачку зіма,—
Здалося раптам, ціха ў дзверы
Яна пастукала сама.

І мне адтуль, дзе ў белых шатах
Начамі сцюжы ўзоры ткуць,
Прыйшла з ялінкай зорка ў хату,
Каб азарыць мой ціхі кут.

І я тады падумаў зноўку:
Чаму маўчаць мае сябры,
Калі мяне сваёй паштоўкай
Павіншавалі ўжо бары?

*1971*

## РОДНЫ КРАЙ

Я слаўлю мой край
І мой горад,
Што плённаю працай жыве.
Вось домік,
Як парус у моры,
Над Свіслаччу ціхай плыве.

Здаецца, нібыта нябёсы
Зямлі свае фарбы далі.
Ускідвае вымпелам восень
Лістоту пажоўклую ліп.

Вось тут, дзе палацы, заводы
І неба падпёр абеліск,
Калісьці Ульянаў з усходу
На захад
Праехаў праз Мінск.

Не быў ён у доміку гэтым,
Ды зведаў яго цеплыню,
Калі сонца новага свету
Прамень несла змрочнаму дню.

Ён ведаў —
Не быць пад прымусам
Такой вось магутнай зямлі,
Дзе крыўду сваю беларусы
На мужныя плечы ўзялі.

Кастрычніка сонца заззяла
Над краем, над светам ярчэй.
І крыўда навек тая спала
З шырокіх народных плячэй.

Табе, горад мой,
Край мой родны,
Паклон ад мільёнаў братоў,—
Край велічнай славы народнай,
Сівых партызанскіх лясоў.

Край песень, адвечных легендаў,
Няскораных бурай людзей.
Над Свіслаччу домік
Стаў сведкам
Вялікіх у свеце падзей.

*1970*

## НА СВАЁЙ ПАРАЛЕЛІ...

О, Зямля!
На табе ўсё апета —
Подых летаў, і вёснаў, і зім.
Але вечна хвалюеш паэта
Ты цудоўным аблiччам сваім.

Касманаўты ў сузорных праменнях
Захапляюцца часта табой.
Ты усім нам прыносіш натхненне,
Радасць, сум
І ў душы неспакой.

Праз ліхія дажджы, непагоды
Не адно пакаленне прайшло.
Дзесьці ж зноў пачынае паходы
Недабітае праўдаю зло.

Ёсць жа недзе яшчэ апантаны,
Бессардэчны і люты зладзей,
Што наносіць заўжды табе раны
І знішчае гаротных людзей.

Я жыву на сваёй паралелі
Мірнай працай на ўсіх на віду.
І калі ў мяне вораг нацэліць,—
Я забіць яго першым пайду.

*1971*

## ІМЁНЫ Ў СТРАІ

Пераправы, плацдармы,
Іржавая сталь ля парогаў,
Енк і плач,
І салдацкая песня ўдалі —
Гэта ўсё ты спазнала,
Акопная наша дарога,
Спавяваўшая грудзі,
Збалелыя грудзі зямлі.
Нашы сэрцы заўсёды
Гарэлі адвагай, імкненнем,
Каб нам болей спазнаць,
Каб нам поўнаю радасцю жыць.
Пасівела ў баях
Маладое байцоў пакаленне
Ды, не здаўшы вышыняў,
На новыя йшло рубяжы.
Радавыя і маршалы
Побач былі, ў адным войску.
Камандзіра ў баі
Замяніць бы мог кожны баец.
Пад Масквой, Сталінградам,
На Керчынскім мы і на Кольскім
З фронта к фронту
Працягвалі рукі свае.

І хоць многім сябрам —
Незабытым салдатам-гвардзейцам
Больш ніколі пад сонцам,
Здабытым крывёю, не ўстаць,—
Іх імёны ў страі
Называем цяпер на паверцы,
Калі сэрцы свае,
Сваю дружбу ідзём правяраць.

*1971*

# ФРАНТАВОМУ КІНААПЕРАТАРУ

Зноў бачу я сосны, бярозы,
Армейскіх байцоў, партызан.
І радасць і горкія слёзы
Даносіць да сэрца экран.

Былі перамогі й няўдачы,
Але мы ішлі па зямлі,
Стаялі ў бітвах гарачых,
Нібыта ў каменне ўраслі.

І тут я пазнаў сваю роту,
З якою пад Курскам ішоў:
Дарогі на розных шыротах
І сцежкі салдацкіх гадоў.

Аб тым, як мужнелі салдаты,
Мацнелі ў акопах франты —
Мільёнам бацькоў нашых, матак
Сказаў кінахронікай ты.

Дык дзякуй за тое, мой дружа,
Што ты вось ад гэтых бяроз
Любоў нашу, вернасць і мужнасць—
Усё да экрана данёс.

*1970*

## САЛДАТ З ДУШАНБЕ

*Мірзо Бабаджану — удзельніку баёў за вызваленне Беларусі*

Нібыта зноў далёкім рэхам
Нам адгукнуўся гул гармат.
З Памірскіх гор
У Мінск прыехаў
Мой сябра, гвардыі салдат.

Музей вайны. Дыхнула боем,
Агнём пантонных пераправаў.
Сам паміраў, ды ўласнай зброі
Ў чужыя рукі не аддаў.

Ішлі дажджы, гулі завеі.
Мінула больш чым дваццаць год.
І раптам... Што гэта?
Ў музеі
Ён свой убачыў кулямёт.

На кулямёце нумар той жа,
Што не забыты з даўніх пор.
Дыхнула зарывам з-пад Оршы,
З-пад Лёзна — хвалямі азёр.

Хто вёз у тыл яго — не помніць,
Бо ў непрытомнасці ён быў.

2 Заказ 1582

ХОТИМСКАЯ РАЙОННАЯ БИБЛИОТЕКА

А кулямёт па нівах, поймах
На захад хтось другі каціў.

Што ж гаварыць цяпер пра тое,
Як цяжка ўсім было ў бядзе.
Ён падышоў да ўласнай зброі,
Прамовіў ціха: «Добры дзень!»

*1970*

## ДЗЕ СОНЦА ЎЗДЫМАЛІ З РУІН...

Туды, дзе ў апошнім паходзе
Мы сонца ўздымалі з руін,
Турыстам праз чвэртку стагоддзя
Прыехаў я зноў у Берлін.

Вакзал.
Нібы госць ля парога,
Стаю. Тут вось кірха была.
Дзе ж тая к Берліну дарога,
Якой наша рота ішла?

Зямля нас вітала салютам,
Як толькі заціхла вайна.
Мы зналі —
Раздзетай, разутай
Чужая была старана.

Я помню галодных і хворых,
Што зблізку ішлі і здалёк.
І мы з камендантам-маёрам
Ім свой аддавалі паёк.

Хто быў дзеля нас чалавекам —
Мы шчасця жадалі усім...

І вось у нагу з бурным векам
Іду я тым шляхам —
Сваім.

Зямля абдае ветрам свежым
Шырокія паркі, бары.
Купаюцца вострыя вежы
Ў праменнях блакітнай зары.

Дамоў і палацаў кварталы
Ўзняліся да самых нябёс.
Я рады, што гэткаю стала
Зямля, куды сонца я нёс.

Хачу прыгадаць ёй, як ноччу
Плылі мы праз Шпрэе-раку,
Але вось юнак
На Карл-плошчы
Мне першым паціснуў руку.

Ён дзякуе шчыра салдату,
Што іх выратоўваў з бяды.
Я зноў,
Як тады ў сорак пятым,
Іду ўслед за маем сюды.

*1970*

## ПОМНІК У ЦІРГАРТЭНЕ

На карце Берліна вядомы
Раён, што асыпан імжой.
Далёка ад роднага дому
Стаіць тут баец
За мяжой.

Стаіць з таго самага мая,
Як толькі закончыў паход.
Над кронамі каска стальная
Вышэй Брандэнбургскіх варот.

Але з той пары
Як на часткі
Берлін быў падзелен вайной,
Салдат з ясназораю каскай
Застаўся у зоне чужой.

На ўсходзе —
Святло Трэпаў-парка
У подыху вольных вятроў.
Там — брат, прад якім
Сонцам ярка
Праменяцца мноства вянкоў.

А ён — за мурамі, на ўскраі, —
Ні кветак, ні сонца яму.

Радзіма ж здалёк заўважае,
Як цяжка стаяць аднаму.

Праз далі, дажджы ветравыя,
Як памяць сяброў баявых,
Сюды, на руіны былыя,
Яна шле сваіх вартавых.

Па нейкаму строгаму праву,
Што, пэўна, даецца не ўсім,
Над чорнаю ноччу шлагбаум
Ўздымаецца перад ім.

То людзі адменнага гарту —
Ці золь, ці грамоў страшны гул —
Сюды да яго, у Ціргартэн,
Свой несці ідуць каравул.

За тое,
Што збавіў ад мукі
Ён многіх бацькоў і дзяцей,
Гатовы падаць яму рукі
Мільёны сумленных людзей.

І ён, як жывы,
Рады вестцы,
Што з родных даходзіць краёў.
Ён будзе стаяць
На тым месцы,
Куды з перамогай прыйшоў.

*1970*

## ЗА ЦІХІМ ОДЭРАМ

За ціхі Одэр, дзе глыбока
Ў вірах схавалася зара,
Прыбыў салдат служыць здалёку
Ад берагоў свайго Дняпра.

Праз тыдзень-два
Ў страі, як трэба,
Ішоў салдат на палігон.
Гулі аж ногі, нылі рэбры —
Так прывыкаў да службы ён.

Перапаўзаў цераз пагоркі
І стометроўку штурмаваў.
А як было на сэрцы горка —
Аб тым нікому не казаў.

Яшчэ зусім, здаецца, ўчора
Так проста ўсё ў жыцці было:
Яго да самага аж бору
Усё праводзіла сяло.

Давезла маці да вакзала
І аддала блакноцік той,

Дзе колісь нумар запісала
Далёкай пошты палявой.

«Вазьмі, сынок... Не знаю, дзе ён,
Наш бацька. Там яго шукай...»
З якой трывогай і надзеяй
Ён прыязджаў у дальні край.

Услед за мараю сваёю
Сюды прынёс за Одэр ён
Блакноцік з поштай палявою,
Што не забыта з даўніх дзён.

Не раз яму казала маці
Пра бацьку і яго сяброў,
Як гэта пошта несла з часці
Ёй многа радасных лістоў,
Калі да самага Берліна
Дайшлі ўжо нашыя франты...
І вось цяпер за бацьку
Сына
Паслаў мой край служыць сюды.

І там, дзе бацька у палатцы
Дамоў апошні ліст пісаў,
Ля ўзгорка
На магіле брацкай
Сын тую пошту адшукаў.

*1970*

# НАД МАГІЛАЙ БАЯВОГА СЯБРА

Прыйшоў я к табе
З дальняй далі
Туды, дзе заканчваўся бой.
Як быццам раней на прывале,
Сяджу ля кургана з табой.
Хоць сёння ты—выліты з бронзы,—
Ды бачу жывога цябе.
Шумяць над табою бярозы,
Схіліўшыся долу ў журбе.
А людзі ідуць пакланіцца
Табе, яснай зорцы тваёй.
І сэрца струменіць крыніцай,
Дзе быў ты засыпан вайной.
Над намі прайшла чвэртка веку.
То — чвэртка бяссмерця твайго.
Табе ж як байцу, Чалавеку
Запалены вечны агонь.
Ні бураю, ні навальніцай —
Нічым яго не патушыць.
Табе ж я данёс праз граніцы
Агонь сваёй шчырай душы.
Гарэлі вялікім запалам
Байцы, што ляжаць у зямлі.
Ім жыць,
Як і іх ідэалам,
З якімі на подзвіг ішлі.

Ты чуеш —
Гудзе майскі ранак,
Расінкі збіваючы з траў.
Цяпер бы ты глянуў з кургана
На тую зямлю, дзе ўзрастаў.
Якое на нівах калоссе,
Якія ўстаюць гарады!
Усё тое, браце, збылося,
Што марай было нам тады.
І ўсе, хто ў вялікім паходзе
Здабыў Перамогі вясну,—
Ты, Ён, Я —
Байцы, палкаводцы,
Запісаны ў кнігу адну.
Усе, хто прайшоў барыкады,
Ці быў на вайне ўпершыню,
Пад Бранскам, Масквой,
Сталінградам
Жывымі ўставалі з агню.
У славе адной п'едэсталаў
Няроўных між роўных няма,
Бо гэтую кнігу пісала
Для ўсіх нас
Радзіма сама.
Жывым нам і мёртвым —
Заўсёды
Гарэць будзе вечны агонь.
Дажджынка праменнага ўсходу
Ляціць мне з нябёс на далонь.

*1970*

# МАЙСКІ САЛЮТ

Май пракаціўся
Першым громам веснім,
І сонца мне пастукала ў акно.
І пачала зноў выкрасацца песня,
Якая ў сэрцы выспела даўно.

Я зноў згадаў,
Як ля бацькоўскай хаты
Дзяўчаты ў вёсцы клікалі вясну,
А мы ўжо там, за Одэрам,
Салдаты,
На подступах заканчвалі вайну.

Бой прагрымеў апошнім гулкім
громам,
У яркім сонцы ўспыхнулі бары.
І мы тады, збіраўшыся дадому,
Салютавалі Маю на зары.

То быў салют
Усім шчаслівым вёснам,
Што здабылі мы, воіны, ў баях...
З вышыняў к сонцу
Узняліся сосны,
Зялёны шум асыпаўшы на шлях.

І не заціх для нас
Той кліч паходны,
Што нас вядзе дарогай мірных дзён.
У майскіх кветках
Сёння край мой родны
Усенароднай славай акрылён.

І нам вясною гэтай урачыстай
Адкрыўся зноў у ззянні ясных зор
Працяг шырокі з'езда камуністаў,
Што ўскалыхнуў увесь зямны прастор.

Над намі сонца свеціць уладарна.
Чырвоны Май—усюды дзе ні глянь—
Набатам, гімнам,
Песняю бунтарнай
Ідзе далёка
Аж за акіян.

Лугі дзівосным квецяцца абрусам.
Наўкол гудзе, красуе Першамай.
І між усіх краёў —
Мой светларусы,
Мой сінявокі
Беларускі край.

*1971*

## КУРГАН БЯССМЕРЦЯ

Дарога Мінск — Масква!
Ты шмат спазнала
Ў гады нашэсця ран цяжкіх і слёз.
Дзе смерць
Асфальт дашчэнту растапляла,
Раскінуў чэрвень кудзеркі бяроз.

Нам не забыць,
Як зноў у сорак трэцім
Мы ў родны край вярталіся назад.
Цалуючы зямлю,
Бег з намі вецер
І падаў у акопы, як салдат.

І там, дзе быў калісь на полі бою
Крывёй паліты кожны ком зямлі,
Курган бяссмерця
Ўзняўся вышынёю,
Якую мы у бітвах не здалі.

Мільёны рук насыпалі пад Мінскам
Курган.
На міг спыніце, трубы, гул!
Між чатырох франтоў

Прад абеліскам
Мы ў ганаровы станем каравул.

Сябры, кладзіце кветкі!
Многім, многім
Яны былі любімымі ў жыцці.
У будні дзень і ў свята Перамогі
Сюды бясконца нам ісці, ісці.

*1971*

## АСТРАНОМ НА РАКЕЦЕ

У наш дывізіён ракетны
Служыць прыехаў астраном.
Ён вывучаў раней планеты
У Пулкаве, дзе родны дом.

Усім вучоным ён — калега,
Гавораць, хлопец з галавой,
Бо можа вылічыць адлегласць
Да зоркі Вегі, да любой.

Пераканаўся кожны ў гэтым:
Ён — астраном і наш салдат —
Дакладна шле у цэль ракету,
Як наканоўвае загад.

Разлік дакладны, як ніколі,
Ён зробіць — воін-астраном.
Ісці у свет абсерваторый
Радзіма выдала дыплом.

Баец вучоны ён, вядома.
Ды камандзір за ўсіх нас рад,
Бо мець дакладнасць астранома
Ён навучыў усіх салдат.

*1970*

## ШЛЯХ БЕЗ ПРЫВАЛУ

Быў загад нам:
Без прывалу
Больш чым трыста вёрст прайсці—
Дзе хутчэй, а дзе памалу,
Як вядзецца у жыцці.

— Трыста вёрст прайсці?
За суткі? —
Проста здзіўлен быў салдат.
— Ат,
Цяпер такая хуткасць,
Што адстане твой пагляд.

Цераз рэкі ходзяць танкі —
Не падумай адставаць.
Паглядзі — бесперастанку
Жураўлі ўвесь дзень ляцяць!

Падбадзёрвалі ў паходзе
Маладога мы байца:
«Хто паддасца непагодзе —
Той не дойдзе да канца».

А баец — і сам бывалы —
Ў акіяне службу нёс.

Так было, што без прывалу
Па пяцьсот праходзіў вёрст.

А цяпер байцы з байцамі
Па сваёй ішлі зямлі.
І далёка за лясамі
Адставалі жураўлі.

*1971*

3 Заказ 1582

* * *

Між гор зялёных ці ў пустыні дзікай
Стаіш ты, воін, сёння на пасту.
Прыслухайся да ўсёй зямлі вялікай,
Як хвалі б'юць і як дубы растуць,
Як весялей шуміць рака ў даліне,
Калі ўзыходзіць сонца над зямлёй,
Як цягнікі стыкуюць мноства ліній,
Ляцяць ракеты ў шлях бясконцы свой.
Перад табой —
Не вузкая мясцінка,
Дзе ты заняў свой каравульны пост.
Ад той, якою крочыш ты, сцяжынкі —
Твая дарога —
У сотні тысяч вёрст.

*1970*

## НАРАДЖЭННЕ БУДЗЁНАЎКІ

Завіруха гуляла наўкола,
Размятала снягі па зямлі.
Навабранцы з заводаў і сёлаў
У Чырвоную гвардыю йшлі.

Год суровы ў замшэлыя хаты
Людзям вестку даносіў з Нявы:
Зорка шчасця
На шапцы салдата
Запалала праменнем жывым.

Рэвалюцыя наша шугала
Ў простай шапцы
Пад зоркаю той.
І ў змаганні будзёнаўка стала
Звонкай песняй
Для арміі ўсёй.

*1970*

## У ЛЕТНІМ ЛАГЕРЫ

Спіць салдат у палатцы абжытай.
Ён не чуе, як сосны скрыпяць,
Як з галін, цёплым ліўнем палітых,
Кропля б'е ў палатняную гладзь,

Як дарога шуміць ветравая,
Па якой на вучэнне ішлі.
Недзе сцежка яго палявая
Зноўку кліча да роднай зямлі.

Спіць салдат.
Так і спаў бы з дарогі,
Шмат гадзін не расплюшчваў вачэй.
А як толькі зайграюць трывогу,—
Ён ускінецца ветру хутчэй.

*1971*

## НА ГРАНІЦЫ

У дождж, спякоту, навальніцу,
Любой парою —
Ноччу, днём
Ішоў заўсёды на граніцу
Рэкс са сваім гаспадаром.

Быў гэткі радасны, бадзёры,
Калі яго вялі на пост.
І вось адразу нейкім горам
Яго спаткаў жыццёвы лёс.

Дзе гаспадар і што ён робіць,
Чаму так доўга не ідзе?
Яны ж былі усюды побач —
І на зямлі, і на вадзе.

Хадзілі сцежкаю адною
Пад ціхай засенню лясной.
І толькі раз начной парою
Штось гаспадар не ўзяў з сабой...

З тае начы, з тае зарніцы
Прайшлі ўжо восень і зіма.

Байцы вяртаюцца з граніцы,
А старшыны усё няма.

Ў казарме ўзвод адпачывае.
Такая позняя пара.
А Рэкс не спіць. Усё чакае,
Шукае след гаспадара.

*1969*

# ЗЯМЛЯ ГЕРОЯЎ

*Д. Ф. Райцаву*

Салдаты ў суровым змаганні
Сцякалі крывёй на палях,
Каб сёння ў зялёным убранні
Квітнела герояў зямля.

Зямля гэта — Бацькі Міная,
Дачок яго ўсіх і сыноў.
Яна нашу ласку прымае
За подзвіг мільёнаў байцоў.

Пад сонцам праменяцца ружы
Ў садах па-над быстрай Дзвіной.
Мы сцежкамі Веры Харужай
Праходзілі разам з табой.

Праз ночы, лясныя грымоты
Да роднай бацькоўскай зямлі
Праз Віцебскія вароты
У тыл мы варожы ішлі.

Мы тут сваю радасць і гора
Дзялілі з матуляй-зямлёй.
Здаецца, не месяц, не зоры —
Палалі кастры над Дзвіной.

## МОЙ ГОРАД

Асветлены заўсёды яснай раніцай,
Мой Мінск расце, квітнее з году ў год.
Я тут жыву на вуліцы Ульянаўскай,
Што ад вакзала выбегла на ўсход.

У радасці, у шчасці і нягодах
Прайшоўшы многа франтавых дарог,
У сорак пятым з дальняга паходу
Я ў родны дом вярнуўся на парог.

Ляжаў мой горад у руінах, помню.
А сёння — волат малады з былін.
І Ленінскі праспект вясновым
промнем
Змрок высвятляе ўсіх ліхіх часін.

Яму мы неслі мужнасць і адвагу,
Сваю любоў, душы сваёй святло.
У той дывізіі, дзе я служыў,
На сцягу
Яго імя напісана было.

Мой родны Мінск,
Табою ганаруся
І слаўлю твой шчаслівы, светлы лёс.

Ты — прыгажосць і слава Беларусі,
Яе палеткаў, пушчаў і нябёс.

Па мужнасці, адданасці у працы
Цябе ўсе знаюць і ў другіх краях.
Ты — наша сталасць,
Нашае юнацтва
І наш святы двухкаляровы сцяг.

Табе складаю песню захаплення.
Расці, ўсміхайся маладому дню.
Ля Дома ўрада
Бачыць родны Ленін,
Як набірае горад вышыню.

*1970*

## У ПАЧАТКУ ВЕКУ

Упіраўся шлях наш крута
Ў неба вузкай паласой.
І цягнуўся май разуты
Ціхім полем за сахой.

Бедака быў лёс нялёгкі,—
Ласкі ў неба не прасіў.
Чуў ён новай долі крокі,
Новай буры на Русі.

Звон балючы, звон кайданаў
Па-над Волгаю не ціх.
Ў новы век юнак Ульянаў
З берагоў ішоў крутых.

Жыць абрыдла па-старому!
Рвалі путы бурлакі,
А на іх з арлінай стромы
Русь глядзела з-пад рукі.

*1969*

# НА РАДЗІМЕ

Еду я лясною, роднай старaной,
Дзе ў маленстве бегаў сцежкай
лугавой.

Люба ўсё мне, міла на маёй зямлі:
Сцежкі, пералескі, ціхія палі.

Кожная травінка мае свой тут пах,
Кожная птушына мае свой узмах.

Я ж дамоў дарогу ведаю ў бары,
Як вада да мора у сівым Дняпры.

*1969*

* * *

У слаўным, нялёгкім паходзе
Чатыры гады мы былі.
У золі, ліхой непагодзе
Грудзьмі прыпадалі к зямлі.

Халоднай і вогненнай даллю
Мы двойчы прайшлі гэты шлях.
Дзе з горкай бядой адступалі —
Зноў неслі наперад свой сцяг.

Калі па разбітых дарогах
На захад вярталіся зноў,
Праз цемру святло Перамогі
Мы бачылі з родных краёў.

Па шэрых руінах Берліна
Вясна Перамогі прайшла,
Зялёнаю хусткай каліны
На полі баёў расцвіла.

Як гром, прагрымела ўладарна
Над гоманам пушчаў і рэк
І легла на ліст каляндарны
Чырвонаю лічбай навек!

*1971*

## НА МАНЕЎРАХ „ДЗВІНА“

Ужо сакавік на балотах
Палонкамі ў неба глядзеў.
Лясы між падталых сумётаў
Курэлі галінкамі дрэў.

Байцы па зямлі беларускай
Ішлі на манеўрах «Дзвіна».
Па сцежках шырокіх і вузкіх
Насустрач шугала вясна.

Да самых дарог падступала
Пралескамі ў сініх снягах.
Героям зямля ўспамінала,
Са славаю пройдзены шлях.

За быстрай Дзвіною ў далінах
Да неба ўзраслі курганы,
Дзе кожны чацвёрты загінуў
За шчасце сваёй стараны.

Пад Обаллю, Оршай і Лёзна
Тут бітвы на рэйках гулі.
Мы пелі пра сосны й бярозы,
Пра шчырасць наддзвінскай зямлі.

Вялі нас бацькі да парогаў,
Бо ведалі —
Мір — наш пароль.
І маці байцам на дарогу
Выносіла з хаты хлеб-соль.

*1970*

# ОДА „КАЦЮШЫ“

Помніш Оршу ў сорак першым годзе,
Як палаў агонь салдацкіх душ?
Наша помста ворагу ў паходзе
Праграмела голасам кацюш.

Пад Масквой, пад Бранскам,
Каля Ліўнаў
Больш дарогі не было назад.
Грознай зброяй у руках былі ў нас
Мінамёт, гармата, аўтамат.

Ды гразнейшай за ўсяго «Кацюша»
Стала нашым ворагам ліхім.
Вытрасала з гітлераўцаў душы
Рэзкім, гучным голасам сваім.

Нашай зброі аддалі мы лаўры,
Слаўна з ёй закончылі паход.
А сягоння, бачыш, «брантэзаўры»
На ўзбраенні ўсіх палкоў і рот?

Мы стаім за мірны лёс планеты.
І каб ёй агнём больш не гарэць —

## СЛЯДЫ НА МЕСЯЦЫ

Вялікі розум чалавечы
З Зямлі пранёсся праз Сусвет
І там, на Месяцы, навечна
Пакінуў свой глыбокі след.

Ідзе па Месяцы у золак
Наш Луназход—бы з сэрцаў зліт—
Упарта круціць восем колаў,
Як восем зоркавых арбіт.

Мне тыя колы нагадалі
Шляхі-дарогі на зямлі,
Якія ў бітвах пракладалі
Бацькі, што волю здабылі.

Я рады з гэтымі радкамі
Цяпер ісці да ўсіх сяброў,
Нібыта ўласнымі нагамі
І я па Месяцы прайшоў.

*1970*

* * *

Былінай, а не марай
Стаў фантастычны свет.
Да Месяца і Марса
Праклалі людзі след.

Узняўся ўвысь ракетны
Дваццаты бурны век.
Якой яшчэ планеты
Дасягне чалавек —

Нептуна ці Венеры,
Ці мо яшчэ якой?
Што там, за стратасферай,
За рысаю зямной?

На многія пытанні
Ідзе адтуль адказ.
Яснее ў зорным ззянні
Наш непаўторны час,

Змяняе шмат праменных
У вышыні шляхоў.
Адно, зямля, нязменна —
Мая к табе любоў.

*1971*

## ПАМІР

Калі над роднаю краінай
Ляцеў з-пад Мінска ў Душанбе,—
Я з роднай прыпяцкай даліны
У сэрцы песню нёс табе.

Тваіх не ведаў я дэхканаў,
Яшчэ не бачыў іх у твар,—
Але душою чуў дыханне
Бурлівых рэк пад шум чынар.

У светлым небе, нібы ў люстры,
Памір мне бачны быў здаля.
І з гор выходзіла насустрач
Твая цудоўная зямля.

Прыйшоў я з чыстай, светлай
думай
З маёй палескай стараны
У край Султанава Мукума,
Фердаусі і край Айні.

Іду праз горы і даліны
Ўслед за магутнай Сыр-Дар'ёй
Туды, дзе Вахшская даліна
Цвіце бавоўнаю густой.

Па гэтых горных перавалах
Хачу я ў той куток прыйсці,
Адкуль да нашага Купалы
Ішоў насустрач Лахуці.

*1970*

# КВЕТКІ З ВАХШСКАЙ ДАЛІНЫ

Раку між горных перавалаў
Перапаўзалі камні ўброд.
І салаўі тут не спявалі,
І не збіралі пчолы мёд.

Ды людзі вечнасць гор прабілі
І Вахш пусцілі на палі,
Зямлю так шчодра напаілі,
Што кветкі з камняў прараслі.

Мяне страчалі тут гасцінна,
Як брата, шчырыя сябры.
І ружы з Вахшскае даліны
Палалі колерам зары.

Табе, Памір, паклон мой нізкі!
А кветкі, што дарыў ты мне,
Я пакладу ля абеліска
У палескай роднай старане.—

Байцам-таджыкам, што са мною
На Беларускі фронт ішлі,
Над Сожам, Пціччу і Дзвіною
За ўсю Айчыну бой вялі.

Яны ляжаць пад сонцам міра,
Дзе сосны стромкія гудуць.
Хай кветкі з горнага Паміра
На Беларусі ім цвітуць.

*1970*

# ГРОНКІ ГЛОГУ

Ля выбітай машынамі дарогі,
Паміж сівых, запыленых слупоў,
Нібы кастры, палаюць гронкі глогу,
Крамяныя ад восеньскіх дажджоў.

Гляджу на гронкі ягад і дзіўлюся —
Чаму раней не сустракаў іх тут?
Я ж бы даўно табе прынесці мусіў
Такое хараство ў твой мілы кут.

Яны б цябе і ў сцюжу саграваля
Пяшчотай, глыбінёй свайго святла.
Я мог бы з іх зрабіць табе каралі,
Каб ты на ўздзіў прыгожаю была.

Я зноў іду знаёмаю дарогай,
Стаю адзін задумліва ў бары:
Як позна я заўважыў гронкі глогу,
Каб маладосць за шчырасць аддарыць.

*1970*

## АСЕННЯЯ КРАСКА

Восень дзіўная, як казка,
Вераснем цвіла.
Ты з асенняй кволай краскай
Да мяне зайшла.

Мы сядзелі, як вядзецца,
У доміку лясным.
Ты пранізвала мне сэрца
Позіркам нямым.

Ці заўважу, ці адчую
Цеплыню вачэй?
Я ж гляджу на краску тую,
Што агню ярчэй.

Краска свеціцца, нібыта
Толькі расцвіла.
Ад вачэй тваіх блакіту
Ўсю красу ўзяла.

Паглядае восень слёзна
З засені лясной.
О, каб з гэтай краскай позняй
Ты прыйшла вясной!

*1970*

## ЛАСІ

Узлескам ранняю парою,
Туды, дзе хтось траву касіў,
На луг стары, да вадапою
Усёй сям'ёй ідуць ласі.

Трымцяць пажоўклыя асіны,
Пад капытамі сучча хруст.
Над сцежкай, быццам рог ласіны,
Разросся ўшыр лазовы куст.

Дарогай вернаю сахаты
Шыбуе проста да ракі.
А следам крочаць ласяняты
І пакідаюць капыткі.

На дол хваёвыя іглiцы
Раняе бор. Пустэча скрозь.
І каб усім вады напіцца,
Іх да стаўка выводзіць лось.

Міне зіма.
Вясной ці ўлетку
Тут, паміж сосен і дубкоў,
На сцежцы зноў праб'юцца кветкі
З вадой набраклых капыткоў.

*1970*

# КУПАЛАВА ТАПОЛЯ

*Ядвізе Раманоўскай*

Шумела стромкая таполя
Над люстрам свіслацкай вады.
Нібы прынёсшы ў горад поле,
Пух рассыпала маладды.

Паўвека толькі прамінула —
І долу рухнула яна.
Не навальніца пахіснула
Яе, не лютая вайна.

Яна праводзіла ў надрэччы
Сваю апошнюю вясну
І аддала зямлі навечна
Свой пух, адцвіўшую красу.

Душу кранаючы да болю,
Ў нябыт галінкі адышлі,
Але пакінула таполя
Глыбокі корань у зямлі.

І хоць вятры прагаласілі
Над ёй пранёсшы шум дуброў,—
Другой таполі не садзілі
Мы, не паслухалі вятроў.

Мы ведалі —
З зямлі карэнне
Ізноў павінна прарасці,
Як з пакалення пакаленне,
Як з клёну клён,
Трава ў трысці.

І рады ўпэўненасці нашай —
Быў у таполі светлы лёс,
І от вясной,
Галоўку ўзняўшы,
З зямлі прабіўся цвет нябёс.

Ён з цемры вырваўся на волю —
З тых незасохлых каранёў,
З той неўміручае таполі,
К якой не раз паэт ішоў. . .

Яна прад ім цвіла, гушкала
У лісці кароткі птушак сон.
З карэння гэтага Купала
Вырошчваў песні светлых дзён.

*1970*

## МАЛОЕ ДРЭЎЦА

У садзе яблынька ўзрасла,
І першай цёплаю вясною
Яна так пышна расцвіла,
Што засланіла ўсіх сабою.

Старэйшым крыўдна за сябе —
На іх галінках менш пялёстак,
А ў маладой
Такі разбег —
Расце, квітнее не па ўзросту.

Яна ўпрыгожыць хоча свет,
Узяць усё ад сонца мая.
«Але нашто ёй гэткі цвет?
Яна ж яшчэ зусім малая.

Хай падрасце,— казалі ўсе,—
Шырэй разгорнецца карэннем».
Па маладой ішлі расе
Да гадаванкі са здзіўленнем.

«Зарана ёй так расцвітаць,—
Яшчэ ў галінках моцы мала.

Патрэбна завязь абарваць,
Каб ёй расці не замінала.

Вось праміне яшчэ гадок —
Такое дрэўца стане цудам».
А гаспадар крануў лісток:
«Не. Рваць я завязі не буду».

І, не кранутая нікім,
Яна ў даспеласць уступіла.
Духмяным водарам сваім
Мне гэту песню падарыла.

*1970*

## МАЁ ПРЫДНЯПРОЎЕ

Ты мяне гадавала з любоўю
І свяціла мне зоркай здаля,
Дарагое маё Прыдняпроўе —
Магілёўская маці-зямля.

Ганаруся табою па праву,
Нескаронай цяжкою бядой.
Радасць працы, салдацкую славу
Падзяляў я заўсёды з табой.

Ганаруся, што я ў Магілёве
Пракладаў сваю сцежку ў жыццё
І часінай нялёгкай, суровай
Не адносіў цябе ў забыццё.

Ганаруся, што шляхам бацькоўскім
Я прайшоў праз агні перапраў,
І да роднай зямлі магілёўскай
Матчын воблік мой шлях азараў.

Нібы рукі матулі, цалую
Ясны сцяг пераможных баёў.
Ўсё жыццё цябе ў сэрцы нясу я,
Родны край — Прыдняпроўе маё.

*1969*

## ПЕРШЫ БУКВАР

Калі яшчэ тлела лучына
У цемры, ў засценках муроў,—
У Полацку мудры Скарына
Свой том рыхтаваў для вякоў.

Філосаф і доктар ён просты,
Да дружбы людзей заклікаў,
Каб кожны гняздо сваё знаў,
Як птушкі уласныя гнёзды.

Бы скарб дарагі і жаданы
Мы том яго ў рукі бяром,
Бо ён для мільёнаў славянаў
Быў першым тады букваром.

*1969*

## ПЕСНЯ АДГУКНЕЦЦА

Дзяцінства і юнацтва пісьменніка Паўла Сямёнавіча Кабзарэўскага, як і маё, прайшло ў Магілёве. Затым мы часта сустракаліся з ім у Ленінградзе, дзе ён жыў і працаваў на працягу многіх гадоў.

Лістком апошнім позна восень
Апала ціха над Нявой.
Тваё ж тут дрэўца засталося,
Што пасадзіў ты сам вясной.

Хай град не б'е па нашых стрэхах,
Па нівах, пушчах каля сёл,
Дзе пераспелыя арэхі
З галінак падалі на дол.

Праз акружэнні і блакады,
Праз буры мы ішлі ў прасцяг.
І ты сустрэць быў сябра рады,
Які прайшоў нялёгкі шлях.

Прасторы роднае Айчыны
Вялі нас ў далечы дарог.
І кожны дзень нам
Быў вяршыняй,
Што ўзяць у штурме воін змог.

Ад Магілёўшчыны рабочай
У пасівелыя гады

Да ленінградскай белай ночы
Ты йшоў праз край свой малады.

З табой гамоняць ціха дрэўцы
І над Нявой і над Дняпром.
А песня вечна адгукнецца
Зямлі, дзе быў юнацтва дом.

*1970*

## СІНЯЕ ВОКА ЗЯМЛІ

Цалуй мацней брыво зямлі,
Чашы крутыя горы,
Тысячагоддзямі бурлі,
Нязморанае мора.

Працуеш ты і ноч і дзень,
Камені амываеш,
Прад непагодаю — гудзеш,
Пад сонцам нас гушкаеш.

Бывае — ціха бераг спіць,
П'е росы з сіні зорнай,
А мора ўсё шуміць, шуміць,
Нязморанае мора.

За нораў грозны аддалі
Табе павагу людзі.
Ты сінім вокам у зямлі
Заўсёды, мора, будзеш.

*1969*

## НА КРУТОЙ ЛЕСВІЦЫ

Іду па лесвіцы высокай,
Прыступку кожную бяру.
Прыступак дзвесце —
Дзвесце крокаў.
Нібыта крочыш на гару.

Штось пад канец сваволіць сэрца,
Прыступак пяць бы тут адняць.
Камусьці ж іншаму здаецца
Замалай гэта вышыня.

Абцасаў тонкіх чуцен тупат,—
Хтось малады уверх бяжыць.
Не трэба лішніх мне прыступак,
Каб галавы не ускружыць.

*1970*

## ВОБЛАЧКА

Яно неабходнаю рэччу
Заўсёды ў паходзе са мной.
Вось я умываюся ў рэчцы
На золку сцюдзёнай вадой.

Выходжу з вады на палетак,
На луг, на сцяжынку сваю —
І воблачка белае гэта
Я з кайстры сваёй дастаю.

Праз рэкі палямі, лясамі
Салдатам іду — не адзін,—
Нясу той рушнік з васількамі,
Што вышыла ты на ўспамін.

*1970*

## АЛЕАНДРЫ

Белай пенаю буяе
Пышны куст на схіле гор,
І пялёсткі сінь марская
Забірае ў свой прастор.

Хай салёней будзе мора,
Весялей квітнее май,—
Мне ж адсюль, з вяршыні горнай,
Бачны мілы, родны край.

Хоць няма там алеандраў
І платанавых вышынь,—
Знаю — сэрца будзе рада
Спелай чырвані рабін.

*1970*

## ПАЛЯЎНІЧЫ

Мы амаль што былі незнаёмы.
Першы раз з ім сустрэўся вясной.
Да ракі, у сасновую засень,
Нас прывабіў начлежны касцёр.

Ён пытаў у мяне тою ноччу,
Ці люблю я ў лясах паляваць?
Я сказаў, што ніводнага зайца
За жыццё ўсё сваё не забіў.

Ён даваў мне армейскія боты,
Прапаноўваў сваё мне ружжо,
Толькі б разам я з ім па балоце
Пахадзіў, асалоду адчуў.

Я на гэта глядзеў раўнадушна,
Бо ніколі з ружжа не страляў.
Ну а ён мне пра лес ды пра птушак,
Быццам любіць іх больш за мяне.

Я сядзеў ля агню, моўчкі слухаў,
З нейкім дзівам глядзеў на яго:
Як ён горда бярэ ў рукі стрэльбу,
Нібы з ёю з'явіўся на свет.

Я зайшоў да яго ў дом абжыты.
Спевам птушак напоўнены дом,
Кружыць кола вавёрка, нібыта
Хоча даць латарэйны білет.

З клеткі птах вылятае расчыненай
За акно і вяртаецца ў дом...
Цвёрда вырашыў я разам з другам
Заўтра рана пайсці на глушцоў.

*1970*

## ВЫШЫВАЛЬШЧЫЦА

Кладуцца ўзоры на белы шоўк,
А прад вачыма — прастор лугоў,

Лясы, палеткі і люстры рэк
І самы блізкі ёй чалавек,—

Той, з кім хадзіла ў зялёны бор,
Каб вышыць потым прыгожы ўзор.

Ішлі па сцежцы насустрач дню.
Адчула сэрца упершыню

І ласку сініх яго вачэй
І вусны, мёду што саладзей.

Там, дзе паляна суніц цвіла,
Сама сунічкай яму была.

Кладуцца ўзоры на белы цвет,
А прад вачыма плыве ўвесь свет.

*1971*

## ЗОРКА ШЧАСЦЯ

Помніш, мы ў маладыя гады
Выбіралі з табой сваю зорку?
Яе ноччу ў паходзе заўжды
Я выглядваў над кожным пагоркам.

Мы наіўнымі, пэўна, былі,
Бо ва ўсякія верылі мроі.
Зоркі ж той,
Што гарыць на зямлі,
Не маглі мы заўважыць парою.

А калі я вярнуўся з дарог,
Людзям радасць прынёс
Перамогі,—
Я наяве тады ўбачыць змог
Зорку шчасця
Над родным парогам.

*1970*

# ПЕРШАЯ ВЯСНА

*Дачцы Людміле*

Для кожнага ў свеце прыходзіць
той дзень,
Калі з маладосцю на вернасць рукаюцца,
За цесным сталом, дзе вяселле ідзе,
Бацькі, і сябры, і сваты сустракаюцца.

Ты сёння сваю прывітала вясну —
Найпершую самую, самую светлую,
Калі, прабудзіўшыся рана ад сну,
Галінкі ў акно табе стукнулі ветліва.

Яшчэ многа вёснаў надыдзе ў жыцці.
А гэта ж — такая,
Адна — непаўторная!
Бо з гэтай вясны ўсё жыццё трэба йсці
З каханым аднымі шляхамі-прасторамі.

Вясёлыя ліпы шумяць за акном,
На кожнай галінцы лісток прабіваецца.
Дык хай жа вясной,
Што прыйшла ў родны дом,
Жыццё маладое тваё пачынаецца.

Тваёй маладосці
Ў такі светлы час
Прыношу я шчырае слова,
сардэчнае.
Няхай жа вясна гэта стане для вас
І самаю першай
І самаю вечнаю.

*1971*

## ПТУШАНЯТЫ ПАКІДАЮЦЬ ГНЁЗДЫ

Кароткі вельмі век у птушак —
Нат не заўважыць чалавек.
Але як шмат ім трэба гушкаць
Галін і пецць за гэты век.
Ўзлятаць да хмар з-пад хвойных
шатаў,
Пералятаць мацерыкоў!
Таму імкнуцца птушаняты
Хутчэй дагнаць сваіх бацькоў.
З вясны да летніх дзён, як быццам,
Яны навукі ўсе прайшлі,
Змаглі не толькі нарадзіцца,
Але і сталасць набылі.
Ім, так падобным
І так розным,
Не век пад крыллем маці жыць.
І вось яны ўзлятаюць з гнёздаў
Увысь,
Хоць нават дождж імжыць.
І як бацькі, што іх вучылі
У дні спякот і непагод,
Яны шырэй разгорнуць крыллі,
Каб самастойны ўзяць узлёт.

*1971*

## БАЛАДА ПРА ГАРНІСТА

Мне помніцца год
Сорак трэці,
Пачатак суровай зімы.
Па першым лядку
Ў сцюжу, вецер
Праз Пціч пераходзілі мы.

Ступіць не паспееш два крокі —
Лядок яшчэ тонкі трашчыць.
Хаціны гараць недалёка,
Над вёскаю неба кіпіць.

Палессе. Зіма.
Для пяхоты
Нялёгкім быў гэты паход.
Наш полк прабіваўся балотам
Па сцежках —
За ўзводам узвод.

Адсталі байцы за ракою.
Мы горнам падалі б ім кліч,
Ды выйшаў гарніст наш
Са строю,
З палком пераходзячы Пціч.

Прад намі бялелі паляны,
Рачулкі бацькоўскай зямлі.
Насустрач адтуль
Партызаны
Да нас з Рудабелкі ішлі.

На спінах кусты маскіроўкі
Тырчэлі, як рогі ласёў.
І тут, ля былой лесніцоўкі,
Мы стрэлі народных байцоў.

Парадак быў строгі ў атрадзе.
Ён зліўся ў адзін з намі строй.
Заўважылі мы —
Ў першым радзе
Хлапчына з вайсковай трубой.

Пры нашай савецкай уладзе,
Што ў тыле варожым жыла,
Гарністам ён быў у атрадзе —
Адзін з піянераў сяла.

Там сцяг над усім сельсаветам
Чырвонай свяціўся зарой.
А дзеці зімою і летам
Вучыліся ў школе лясной.

«Я хлопец бывалы»,— гаворыць
Пагляд яго смелы, жывы.
І вось па загаду маёра
Ён збор нам заграў палкавы.

Няслося ў прасторы лясныя:
«Усе падымайцеся ў строй!»
І вочы яго агнявыя
Аж лёд растаплялі зімой.

Гарачых вачэй тых забыць я
Дагэтуль, прызнацца, не мог.
Трубіце, гарністы, трубіце
І клічце у далеч дарог!

*1971*

## ГЕРОІ ЧАРНАМОР'Я

Былі грудзьмі — да хваль марскіх,
Спіною — да гранітных скалаў.
І волю іх, і сэрцы іх
З маленства мора гартавала.

Прад навальнічнаю парой
Яны, як сокалы, ўзляталі,
А ў грознай буры штармавой
Да камняў прыпадалі хваляй.

Іх помняць Керч, Сухі Ліман
І Севастопаль легендарны,
Калі ў агні марскі туман
Загойваў ім цяжкія раны.

Паміж заток, на схілах гор
Ішлі сваёй перадавою.
Калі страшней звярэў віхор,—
Яшчэ гучней грымела зброя.

Ім быў акопам паміж скал
Разбіты бераг каля дока,
А брустверам — дзевяты вал,
Што уздымаў іх так высока.

*1970*

# НАШЫ БАРЫКАДЫ

*Піліпу Пестраку*

Не ведалі краты
Ні слёз і ні здрады,
Адно толькі —
Веру у радасць жыцця.
Салдата жыццё —
Кожны крок — барыкада,
З якой узлятаў акрываўлены сцяг.

Радзімы святло азарала нам далі.
І хоць у жыццё уступаў хтось пазней,—
Салдаты сябе для баёў гартавалі,
Каб дрэўкі штандараў
Узняць нам вышэй.

Калі ж напаткала вялікае гора,
Агнём запалалі лясы і палі, —
Ад Белага мора
Да Чорнага мора
Мы ўсе барыкады свае занялі.

На новы рубеж баявымі шляхамі
У апошнюю бітву ішлі пад агнём.
Мы краты ў засценках ламалі штыкамі,
Зямлю саграваючы зорак святлом,

Вясне Перамогі, як сонцу, мы рады,
І ў сэрцах праносячы песень цяпло,
Мы будзем стаяць на сваіх барыкадах,
Каб слова Радзіма
Заўсёды жыло.

*1969*

## КРАСАВІЦКАЯ ПЕСНЯ

І зноў разраслася вясна маладая
Нябачным кружочкам у стволе сасны.
А песня ільецца над полем і гаем
Пра светлую радасць далёкай вясны,
Калі па-над Волгаю руская маці
На радасць усім нарадзіла сынка
І выйшла насустрач
На голас дзіцяці
Бунтарная песня з душы бурлака.
Затым гэты кліч
Стаў Ульянава клічам,
Каб выпрастаць плечы,
Што крыўду нясуць.
У Ленінскім светлым і родным абліччы
Мы ўбачылі ўсе
Нашу радасць — вясну.
Ідзе яна песняй ад дома да дому
І сонцам палае ў зялёнай красе.
Мы рады, як сонцу,
Ўсяму дарагому,
Што ў ясных прасторах
Цвіце па вясне.
Вясна кроча ў хаты святлом
прамяністым,

Усіх сагравае, бацькоў і дзяцей,
Тым словам,
Якое ўзнялі камуністы
На з'ездзе сваім
Для мільёнаў людзей.
Усё, што здабыта адвагай, бясстрашшам,
Што зробім —
Прымаем як свой запавет,
Бо з нашым народам
І з Партыяй нашай
Яднаецца сёння працоўны сусвет.
Хай стануць лягчэйшымі сцежкі
ў паходзе
І ззяюць ясней
Далі ў новай хадзе.
Бо Ленін вясною
Ідзе праз стагоддзі,
На новыя подзвігі
Ўсіх нас вядзе.

*1971*

## ТВАЯ СПАДЧЫНА

*Чырванасцяжнай*
*Беларускай Ваеннай Акрузе*

Над краем, дзе сонца заходзіць,
Ухутанае у блакіт,
Заззяла тваё паўстагоддзе,
Адбіўшыся ў люстры ракі.

У бітвах салдатам адданым
Ішла ты дарогай бацькоў.
У многіх смыляць яшчэ раны
Ад бур агнявых, ад штыкоў.

Хто маці, хто бацьку, хто друга —
Гублялі ў цяжкой барацьбе,
Бо першаю наша акруга
Прымала удар на сябе.

Пад Брэстам, над роднай зямлёю
Ўтрымала ты сцяг праваты.
Ішлі потым разам з табою
Аж тры Беларускіх франты.

За стойкасць, адвагу і смеласць
Пашана гвардзейцам тваім.
Ты мужнасць і волю Гастэлы
Пакінула ў спадчыну ім.

*1969*

## САСНА НАД ДНЯПРОМ

Памяці ўзбекскага паэта Султана Джураева, які загінуў пры фарсіраванні Дняпра ў раёне Любеч восенню 1943 года

Салдацкая памяць нагоду
Данесла з растайных дарог.
Баец не закончыў паходу
І тут назаўсёды прылёг.

Ад роднага краю далёка
Ляжыць ён пад гонкай сасной,
Што белыя ў небе аблокі
Падпёрла вяршыняй сівой.

Дзе мы на кароткім прывале
Сядзелі ўначы ля кастра,
Шуміць яна
На перавале
Ля кручы сівога Дняпра.

Пад небам над сіняй далінай
Пражэктар — як вогненны брус.
Налева — сястра Украіна,
Направа — мая Беларусь.

Прысядзем, салдат, як бывала.
Глядзі — які бераг круты!
А дзесь, за другім перавалам,
Аул, па якім бегаў ты.

Там ружы, ў тваім Андзіджане,
Цвітуць ад вясны да вясны.
А мы, покуль сонца не ўстане,
Пакурым ля гэтай сасны.

Была яна сведкай тваёю,
Як поўз ты па горле траншэй.
Табе праз Дняпро
Той пароюю
Плысці было значна цяжэй.

Ты нат не паспеў сваёй любай
Ліст поштай паслаць палявой.
Не знала яна, што з-пад Любеч
Ужо не напішаш ты ёй,

Што ты са смяротнаю ранай
Ідзеш у бяссмерце — баец!
І сёння узбеку Султану
Дняпро свой паклон аддае.

Расказвае ўсім нам пра мужнасць
Тваёй нескаронай душы,
Як ты непахісна, мой дружа,
Стаяў на сваім рубяжы,

Гарэлі заўжды твае вочы
Нянавісцю к смерці, к вайне.
Але, калі што —
Ты і ўночы
Заграй у сурму сваю мне.

Салдацкай не склалі мы зброі,
Я ў строй наш гвардзейскі байцом
Гатоў стаць любою парою —
Хай скажа
Сасна над Дняпром.

*1968—1971*

# ВЕТРАВЫЯ ШЛЯХІ

*Паэма*

**1**

Льецца рэха наўкола
Медным звонам сасны,
І нясуць мяне колы
На паўстанак лясны.
Між ялін, пасівелых
Ад халодных вятроў,
Разыходзяцца стрэлы
І сыходзяцца зноў.
Да юнацкіх парогаў —
Светлай юнасці дзён —
Я знаёмай дарогай
Еду ў дальні раён.
Свеціць вогнік зялёны
У лясной старане.
Можна ў цэнтры раённым
Пагасціць крыху мне.
Быў бы госцем жаданым
І ў сяле, за ракой.
Мне ж патрэбны паўстанак
Маладосці маёй.
Кліча сцежка лясная,
Што ў пасёлак вяла,
Тая хатка, якая
Самай роднай была.

Клічуць рэчка, даліна,
Дзе шумяць хмызнякі,
Кліча гай салаўіны,
І сябры-землякі
Тут чакаюць сустрэчы
На шляху баравым.
І я песняй сардэчнай
Адгукаюся ім.
Адгукаюся соснам,
Што гушкалі зіму,
Маладым сінім вёснам
І паўстанку свайму.
Ён, за іншых не горшы,
За Дняпром між лясоў
Прапускае на Оршу
У дзень па сто цягнікоў.
Ля чыгункі — ракіты
І рамонкі ў траве,
Домік, гонтамі крыты:
Тут сяброўка жыве —
Не старая па ўзросту,
Дый не першай вясны.
Паміж стрэлачніц простых
Служыць з самай вайны.
Ноччу, вечарам, ранкам —
Дождж ці дрэвы ў расе —
На сасновым паўстанку
Пільна службу нясе.
Як гудкі загукаюць,—
У адказ тым гудкам

Стрэлкі пераключае
Яна ўсім цягнікам.
Колькі стычана стрэлак
Пад сігналы гудкоў!
Колькі ўдаль праляцела
Перад ёй цягнікоў!
У стальным, звонкім гудзе
Ад вясны да вясны
Едуць розныя людзі
Праз паўстанак лясны.
Цягнікі! Пралятайце
Ды вяртайцеся ў час,—
Тых нідзе не мінайце,
Хто чакае тут вас.
На яе паглядзіце,
На Марыну Дацук.
Як цягнік праімчыцца —
Сэрца стук,
Стук ды стук.
І спакою не мае.
А чаму, ад чаго?
Ўсё глядзіць і чакае
Эшалону свайго.
Едуць людзі чужыя,
Але болей — свае.
Там, дзе сцежкі лясныя,
Заўважаюць яе.
Ёй старэць яшчэ рана
На жаночым вяку.
Калі б разам з каханым

Тут прайшла пад руку,—
Ўміг асыпаўся б іней,
Што ў дзяўчат на вачах,
Усе «максі» і «міні»
Уступілі б ёй шлях.
Паглядзіце на рукі —
Як пярсцёнак зайграў!
Валасы? Гэта хустку
Вецер ёй растрапаў
Каля рэйкавай сталі,
Як кудзельку ільну,
Ёй завеі часалі
Валасоў белізну.
Але гэта — нічога,
Ты душу заўважай.
Наша служба — дарога
З дома ў дом,
З краю ў край.

**2**

На паўстанак у вечар
Уварваўся экспрэс.
Стаў.
Праходзіць сустрэчны —
«Масква — Брэст».
Паміж двух эшалонаў
Я спыніўся на міг.
Свецяць вокны вагонаў —
Углядаюся ў іх.

Эх, пайсці б мне дадому
Ад экспрэса хутчэй!
Але здаўся знаёмым
Позірк карых вачэй.
Пэўна, бачыў я недзе
Гэты позірк жывы:
Няўжо сёння тут едзе
Наш камбат франтавы?
Камандзір наш — той самы,
Нескароны ў баях,
Дзе служылі байцамі
І Марына, і я?
Ці пазнаў ён, хто зноўку
Адчыніў семафор,
Ці убачыў сяброўку
Пасівелы маёр?
Ён жа быў чалавекам,
Сябрам быў нам усім...
І амаль чвэртку веку
Мы не чулі аб ім.
Запытаць бы адразу:
«Вы, таварыш маёр?
Наступалі мы разам
На Патсдам і Вюнсдорф.
Вы дайшлі да Берліна
З батальёнам сваім.
Тут вось ваша Марына
На паўстанку лясным...»
Так на скроні сівыя
Збоку я паглядаў.

Можа рысы чужыя
За яго я прымаў?
Можа я памыліўся —
То не ён, не камбат?
Скажа: «Ў сне я прысніўся
Вам, таварыш салдат».
Мо кудысь за паўсвета
Едзе ён за мяжу?
І Марыне пра гэта
Я пакуль не скажу.
Растрывожваць не стану
Я старых яе ран.
Хай трывогі растануць,
Як асенні туман.
Можа будзе не рада
Эшалону таму?
Можа нейкі выпадак
Стаў віною ўсяму
Ці адзін, незабыты
Міг, з якога навек
Лёг, як камень разбіты,
На душу чалавек?
З той раптоўнай хвіліны
Ці з імгнення таго
Не чакае Марына
Эшалону свайго.

**3**

Напэўна, ў кожнага на свеце
Далёкі свой паўстанак ёсць,

Куды з-за хмар, густога вецця
Даходзіць рэхам маладосць.
І сёння ўспомніла Марына
Свае дзявоцкія гады.
Яна салдатам да Берліна
Таксама йшла ў страі тады.
Там, ля рэйхстага, дзе канала
Навек крывавая вайна,
Рэгуліроўшчыцай стаяла
Між смерцю і жыццём яна.
Руіны, брук
І гул машыны —
Нібы было ўсё так даўно!
Нядаўна ж бачыла Марына
Сябе самую у кіно:
Малыя кірзавыя боты,
Рэйхстаг з пахмурнасцю калон
І Брандэнбургскія вароты —
У кінахроніцы тых дзён.
Ды што ёй хроніка старая,—
Час устрывожыў сэрца зноў:
Стаіць яна
У сонцы мая
На скрыжаванні ўсіх вятроў.
Сваімі яркімі сцяжкамі
Шляхі паказвае сябрам
Пад неспакойнымі вятрамі
На Брандэнбург
І на Патсдам.
Твар абдае дарога пылам,

Соль пакідае на плячах.
А сэрца рада —
Родным, мілым
Байцам дамоў адкрыўся шлях.
Праз Брандэнбургскія вароты
Пад грукат конскіх капытоў
Ідуць назад
Гвардзейцаў роты
Адважных Жукава палкоў.
Ідуць яны да родных гоняў.
Іх не злічыць, палкоў і рот.
А з вышыні старых варот
Глядзяць абсмаленыя коні.
Рэгуліроўшчыца на бруку
Стаіць, нібыта у страі.
Адно махаюць толькі рукі,
Як крыллі птушкі у гаі.
Рэйхстаг разбіты, закурэлы.
На ім відаць сляды штыкоў.
Сама б, як птушка, паляцела
Яна адсюль хутчэй дамоў.
Але пакуль няма загаду —
Стой на пасту сваім, салдат!..
Яшчэ душу цяпліла радасць:
Быў побач ён —
Яе камбат.
Чаму яе? Хто даў ёй права
Камбата называць сваім?
Вышэйшы чынам ён
І славай,

Яна ж —
Яшчэ дзяўчо прад ім.
Што даў ёй лёс? —
Пагляд вясёлы,—
Шырокі лоб, брыва разлёт...
Яшчэ нядаўна з камсамолам
Ішла ў першы свой паход.
Тры леты цемра панавала
У хатах роднага сяла.
Дзяўчыне чорная навала
Закончыць школу не дала.
Дзе тая школа?
Ў зацямненні
Былі забіты вокны ў ёй.
І добра, што пры вызваленні
Марыну ўзяў маёр з сабой.
І от ёй выпала дарога —
Байцом з камбатам побач стаць.
Быў ён старэйшы не намнога —
Ўсяго гадоў якіх на пяць.
Маёр душой любіў Марыну
Паміж усіх дзяўчат-байцоў.
«Пабудзь яшчэ,— казаў,—
З Берліна
Мы разам вернемся дамоў.
Там, на паўстанку, каля Оршы,
Адзначым май мядовы свой...»
Ды не збылося...
Службу нёсшы,
Ён не мінуў бяды цяжкой.

Калі стаяла са сцяжкамі
Марына на пасту сваім,
Маёр з байцамі-шафярамі
Да Эльбы ехаў ранкам тым.
Яшчэ вяла там бой брыгада
І дабівала гарнізон.
Туды гранаты і снарады
Падвозіў аўтабатальён.
Гулі трывожна ночы мая,
Як выбягала на шашу...
І вестка,
Самая цяжкая,
Перавярнула ўсю душу.
З тае шашы,
Што разбамбёна
Была ў апошні раз вайной,
Амаль палова батальёна
Больш не вярнулася у строй.
Балюча сэрца зарыдала:
«Ну вось —
Прайшоў усю вайну,
А тут...»
Адкуль тады напала
Бяда на іхнюю вясну?
О не, не плакала Марына:
Яна ж баец, яна салдат.
І толькі доўга той сцяжынай
Хадзіла, дзе хадзіў камбат.
Успамінала дні і ночы,
Калі была заўсёды з ім,

І доўга, апусціўшы вочы,
Аб чымсьці думала сваім...
За Эльбу птушкі адляталі,
І адыходзіла вясна.
Нідзе — ні ў часці, ні ў шпіталі —
Камбата не знайшла яна.
Перажылі ў той мірны ранак
Шмат людзі радасці і слёз.
З Берліна
На лясны паўстанак,
Сюды цягнік яе прывёз.
Пасля ў штабы, ваенкаматы
Яна звярталася не раз.
«Не маем весткі пра камбата»,—
Быў адусюль адзін адказ.
З тых пор
Нямала год мінула,
Ды ўсё ёй помніцца Берлін.

...А цягнікі імчацца з гулам
Праз многа станцый і краін.
Каля яе праходзяць ганку,
Мінаюць бор, высокі плот,
Дзе стрэлачніцай на паўстанку
Яна працуе дваццаць год.
Была і ў радасці і ў крыўдзе,
Ды не згубіла з даўніх дзён
Надзею ў сэрцы,
Што ён прыйдзе,
Яе шчаслівы эшалон.

4

Адаспелі ажыны
Цёплай жніўнай парой.
З поля пах канюшыны
Нёс на пасеку рой.
Бор, праменны і гонкі,
Зліўся з шумам вятроў.
І шчаслівыя жонкі
З працы крочаць дамоў.

Сонца, шчодрае лета
Ўсюды бачаць яны.
А Марынін палетак —
Рэйкі, рэйкі адны.
Многа летаў і вёсень
На лугах адцвіло.
Ці ўсё ж тое збылося,
Што у марах было?
Ці прынёс лёс дзяўчыне,
Што прынесці ёй мог?
Час быў выйсці Марыне
На шырокі разлог.
А яна нібы ўзмежкам
Ужо колькі гадоў
Тут адна вузкай сцежкай
Ходзіць з дому й дамоў.
Былі стрэчы, разлукі,
Як ва ўсіх у людзей.

Прапаноўвалі рукі
Ей, каб жыць весялей.
Нават сватаўся часта
Падпалкоўнік былы.
Ды адмовіла ў час той —
На руках сын малы.
Не крыўдуе Марына
На сваю маладосць.
Прыгажосць, чэсць жанчыны,
Праца — ўсё ў яе ёсць.
Могуць ёй пазайздросціць —
«Прыгажуні з глушы».
Толькі от весялосці
Не хапае ў душы.
З воч усмешка апала,
Нібы хваля на дно.
Як Марына кахала —
Знала сэрца адно.
Упаў пялёсткаю белай
Цвет дзявочых гадоў.
І даўно адбалела
На душы ўся любоў.
Нават слухаць ёй горка
Аб жаночай красе.
«Не ўдава і не жонка»,—
Кажуць людзі усе.
Ды не ўсё яны бачаць,
Не ўсё знаюць спаўна.
Ім не знаць, чаму плача
Часта ўпотай яна.

У заходнюю далеч
Паглядае на шлях...
Выцвітаюць караллі
У яе на грудзях,
Як асенняя гронка
На рабіне густой.
«Не ўдава і не жонка», —
Усё чуецца ёй.
Што ж, няхай пагавораць —
Зарасце ўсё быллём.
Было ў кожнага гора,
Ёсць і шчасце сваё.
Хоць не жонка, ды маці —
Не з апошніх жанчын.
І ў Марыны ёсць шчасце —
Дарагі, родны сын.
Ужо трэцяя восень,
Як у войска пайшоў.
З палявой пошты носяць
Шмат ад сына лістоў.
Мо з другімі байцамі
Зараз кроча ў дазор
Там, за тымі лясамі,
Дзе быў бацька-маёр?

**5**

Мы гамонім з Марынай
Да глыбокай начы.
Пра юнацтва ўспамінам
Песня ў хаце гучыць.

Ад душы запрасіла
Мяне ў шчыры свой дом.
Вочы свецяцца сінім
Маладым аганьком.
Як сустрэчы быў рады
Я з сяброўкай сваёй!
І гляджу на прысады
У акно раніцой.
Бачу рыжыя клёны,
Родны наш Сіні Лес.
Зноў прыпомніў вагоны,
Хуткі стрэчны экспрэс.
З тае самай хвіліны,
Як сюды я прыбыў,
Бы знарок ад Марыны
Штосьці ў сэрцы ўтаіў.
Мо на шчасце ці гора
Не кажу ёй аб тым,
Быццам бачыўся ўчора
З яе мужам былым.
Калі б ён, дружбе верны,
Паміж нас дзесьці жыў,—
Пэўна ў войску цяпер бы
Ён палкоўнікам быў.
Полк бы вёў свой у поле
Там, дзе сціхла вайна,
І яна з сваёй доляй
Не была б тут адна.
Над чыгуначным шляхам
Толькі бачыць свой цень.

А на ўсход і на захад
Едуць людзі штодзень.
Едуць з роднага краю
У другія краі,
Дзе апошнія ў маі
Адгрымелі баі.
Едуць днём, едуць ноччу
На Маскву, на Патсдам.
Толькі колы грукочуць
Тут і там,
Тут і там.
Да бацькоў едуць дзеці
І бацькі да дзяцей.
Многа дзіўнага ў свеце,
Многа розных людзей.
І бывае тут людна
Між ялін маладых,
Дзе яна ў святы й будні
Каля рэек стальных.
Над чыгункаю важка
Ззяе поўня ў цішы.
Ды ніхто не заўважыць
Адзінокай душы.

**6**

Залатое калоссе
Адшумела ў палях.
Жаўтакудрая восень
Сыпле лісце на шлях.

Пойдуць зноў непагоды
Лістападнай парой.
Вецер злосны, халодны
Дым нясе над зямлёй.
О, вятры на раўнінах,
Не трывожце вы нас!
Сёння свята ў Марыны —
Надышоў яе час.
І адкуль ёй — не знае —
Лёс паслаць гэта мог?
У Маскву выклікае
Сам начальнік дарог.
Нават лішняга слова
Ў тэлеграме няма.
«Да мяне — тэрмінова...» —
Прачытала сама.
Я Марыне ўвесь вечар
Кветкі ў лесе збіраў.
Новай, радаснай стрэчы
Ёй ад сэрца жадаў.
Ў шлях шчаслівы, Марына!
Хопіць жыць у журбе.
Там за працу, за сына
Будуць дзякваць табе.
Тваё сэрца сягоння
Рада, поўна надзей.
У плацкартным вагоне
Едзеш ты між людзей.
Ты — шчаслівая маці,
Не з апошніх жанчын.

У цябе — тваё шчасце —
Дарагі, родны сын.
Пачынаецца будзень,
Светлы дзень над зямлёй.
І харошыя людзі
Едуць побач з табой.
Не распытваюць доўга,
Дзе працуеш і кім,
Як ты плакала многа
Па каханым сваім.
Як чакала ты весткі
Кожным летам, зімой,
Як ты стала з нявесты
Незамужняй ўдавой.
Як з цябе кпілі дурні,
Што салдатам была.
Ты ж праз сцюжы-віхуры
Франтавічкай прайшла...
І ты — простая з простых,
За ўсіх плётак вышэй...
Колы мераюць вёрсты
Ўсё хутчэй і хутчэй.
Хутка будзе сталіца —
Сэрца роднай зямлі.
Прыйдзеш ты падзівіцца
На палацы ў Крамлі.
Паглядзіш у здзіўленні
З заміраннем душы
На той домік, дзе Ленін
Спачывае ў цішы.

Потым пройдзеш тым пляцам,
Дзе не кожны быць мог,
Потым пryme ў палацы
Сам начальнік дарог.
Я не ўчую размовы,
Але ўпэўнен цяпер,
Што сардэчныя словы
Там чакаюць цябе.
Ты дарогай салдацкай
Са сваіх зім і лет,
З прыдарожнае хаткі
Зноўку едзеш у свет.

7

Ціхі домік на ўзлессі
Сумным стаў да пары.
Падыходзіць да весніц
Паштальён на зары.
Ён лісты і газеты
Аддае мне, як дар.
Нібы ў доміку гэтым
Сёння я гаспадар.
Я ж прэтэнзій не маю.
Гэты домік — не мой,
Проста я зберагаю
Ў ім жыццёвы спакой.
Я начую і днюю
На паўстанку лясным.
Каля рэек хаджу я

Ціхім шляхам сваім.
А ці лягу, ці ўстану —
Кружыць думка адна —
А калі на паўстанак
Зноў прыедзе яна —
Мой харошы таварыш
І сяброўка мая?
Ці ж мы з ёю не пара,
Ці благая сям'я
Зноў была б у Марыны,
Каб я мужам ёй стаў
І калі б яе сына
Як свайго шанаваў?
І у доміку цесным
Не было б удавы:
Гаспадыня экспрэсам
Ужо едзе з Масквы.
Вось ляжыць тэлеграма:
«Не сумуй, дружа мой.
Еду ў горад
Той самы,
Дзе заканчвалі бой...»
Бой? Які? Зналі многа
У вайну мы баёў.
За мяжу мо дарога
Ёй накрэслена зноў?
І ужо дальніх станцый
Семафоры відны.
Не чакаў нат, прызнацца,
Я такой навіны.

А цяпер вось чакаю
Я цудка аднаго,
Бо яна пад'язджае
Да паўстанка свайго.
Я стаю каля ганку,
Дзе шуміць Сіні Лес.
На маленькім паўстанку
Супыніся, экспрэс!
Над раўнінаю рэе
Спелы клён на гары.
Паглядзі — каля рэек
Домік твой у бары.
Праз акенца вагона
Бачыш луг, цёмны бор?
Для твайго эшалона
Ўжо адкрыт семафор.
Рэйкі іскрамі ззяюць,
І ў руках юнака,
Што цябе замяняе,
Б'ецца дрэўка сцяжка.
У адказ мне залужжа
Прагудзела гудком:
«Я сягоння, мой дружа,
Пакідаю свой дом.
Еду аж да Берліна
Зноўку шляхам сваім.
Там сустрэнуся з сынам,
А быць можа, і з ім —
З тым,
Хто часу так многа

Мне лістоў не пісаў,
Пра каго ты нічога
Ўчора мне, не сказаў...»
О, экспрэс міжнародны,
Хоць хвілінку пастой!
Не, не стаў.
Домік родны,
Берагу твой спакой.

## 8

За адным семафорам
Адчыняюць другі.
Там — за горадам горад,
Многіх рэк берагі.
Край народнае славы
І пушчанскіх далін.
А далей там —
Варшава,
За Варшавай — Берлін.
На шляху —
Тры краіны:
Свой у кожнай прастор,
І адкрыт для Марыны
Ўсюды там семафор —
Да вясны самай ранняй,
Што ўставала з агню,
Дзе спазнала каханне
У жыцці ўпершыню.
Хай жыве яно вечна

Гімнам сонцу, вясне,
Песняй самай сардэчнай,
А не мрояй у сне,
Будзе светлаю явай,
Каб яго праслаўляць.
І любві той, як славы,
Я не буду чапаць.
Многа розных бывае
Для расстанняў прычын:
Бацька сына не знае,
Бацьку роднага — сын.
Але як жа на свеце
Сёння хочацца жыць,
Усё любіць,—
Нават вецер,
Што насустрач бяжыць.
Разам сёння з Марынай
Еду ў думках сваіх
Да байца — яе сына,
Да сяброў баявых.
Сын! Трымае хай цвёрда
Ён руку на курку.
А што робіць ён, родны,
Зараз там, у палку?
Мо дакладвае штосьці
Камандзіру свайму?
І не знае, што ў госці
Едзе маці к яму.
Хлопчык, воін мой мілы.
Не трывожся ў журбе.

Ведай — мы не таілі
Дум сваіх ад цябе.
Над табой, нібы ў казцы,
Уздымаўся твой век.
Для яго
Ў дружбе, ласцы
Ты ўзрастаў — Чалавек.
А падрос — фатакартку
Сам з шуфляды дастаў
І з пагонамі бацьку,
Свайго бацьку пазнаў.
На той картачцы самай
Маці бровы ўзняла,
Бо і маці таксама
Ля рэйхстага была.
Ты цяпер сам, як бацька,
На вучэнні ўначы
Аўтамат свой і скатку
Там нясеш на плячы.
Да ўсяго ты ахвочы,
Хутка к службе прывык...

Па-над Одэрам ноччу
Мост праходзіць цягнік.
Недзе блізка між веццяў
Ўмыўся месяц расой,
І панёс стрэчны вецер
Хмарку ўдаль
Над зямлёй.

9

Над Берлінам —
Быццам поўня,
Тэлевежы сіні шар.
Між зялёных вуліц роўных
Дом у цэнтры —
Аж да хмар.
Днём асеннім,
Як і веснім,
У завулках і ў садах
Ружы ўсюды каля весніц
Вам нясуць мядовы пах.
Вось і тыя коні зноўку,
Што абсмалены былі...
Я разглядваю паштоўкі
Са знаёмай мне зямлі.
Тут Берлін, Патсдам і Цосен,
Аўтастрады — ўвысь і ўніз.
Мне адтуль прынеслі ўвосень
Ад сяброўкі новы ліст.
Як Марыну ў дальнім краі
Стрэлі тысячы байцоў,—
Я пра гэта добра знаю —
І не толькі з нечых слоў.
Не забудзем майскі ранак,
Наш апошні жорсткі бой,
Як была зямля ўзарана
Ненажэрнаю вайной.
Не пазнаць цяпер Берліна,—

Бы другая старана.
Зараслі даўно руіны,
Што пакінула вайна.
Нейкі момант урачысты
Адчуваецца душой.
З дальняй Афрыкі турысты
Тут праходзяць грамадой.
Паглядзець ідуць ахвотна
На калоны тых варот,
Дзе прайшлі даўно ўжо
Сотні
Штурмавых савецкіх рот,
Дзе распісваўся штыкамі
На рэйхстазе батальён.
І Марына са сцяжкамі
Тут стаяла ля калон.
Узлятала чырвань сцяга
Пераможнаю вясной.
Зараз вее ад рэйхстага
Зноў замшэласцю былой.
Але ён таго не варты,
Каб яго распісваць зноў.
За бацькоў стаяць на варце
Сотні, тысячы сыноў.
Маладыя вулкі, плошчы —
І Марына праз Берлін
Трэптаў-паркам ціха крочыць.
Побач з ёю — родны сын.
Ўсхвалявана б'ецца сэрца,
Нібы парастак вясной.

Дай жа, сынку, наглядзецца
На юначы воблік твой.
Ты і выпраўкай салдацкай,
І характарам — агонь.
Бацька, выліты ўвесь бацька —
Зерні з поля аднаго.
Тыя ж вочы,
Позірк смелы,
Нібы глянуў сам камбат...
Ды нікога не сустрэла
Са сваіх байцоў-дзяўчат.
Ні сяброўак, ні камбата,
Што за брата быў радней.
Дзе вы, мілыя дзяўчаты —
Сведкі даўніх бур, завей?
Пад дажджом і сонцам яркім
Вы ішлі да перамог,
Санітаркі, кулінаркі —
Сёстры вогненных дарог.
Разышліся па дарогах
Да сваіх палёў і рэк.
І хоць быў камбат ваш строгім —
Будзе помніцца ўвесь век.
Роем думкі,—
Не суняць іх,—
Зноў кудысьці ўдаль ляцяць.
Сын не ведае, як маці
Час той цяжка ўспамінаць.
Локцем к локцю,
Крок да кроку —

Крочаць маці, сын-салдат.
Тут вось лагер недалёка,
Дзе стаіць іх аўтабат.
Ды не тыя ўжо машыны
І не той з металаў сплаў...
Самым яркім для Марыны
Гэты дзень асенні стаў.
Полк гвардзейскі
Перад ёю,
А Міхаська — як герой,
Прад усім салдацкім строем
Побач з маці дарагой.
О, каб людзі свету чулі,
Разумелі гэта ўсе:
Сын дакладвае матулі,
Як ён службу тут нясе.
Смела ў вочы паглядае
Ўсім сябрам,
Глядзіць удаль.
На грудзях салдата зззяе
Яркі ленінскі медаль.
І такіх, як ён, нямала
У дывізіі байцоў.
— Можа б, мама, ты сказала
Пра сябе хоць пару слоў?
А яна — бы ўсё забыла.
Аж ступіць ёй цяжка крок:
— Дзякуй, мой Міхаська мілы!
Пра сябе скажы, сынок!
Зноў успомніла, згадала,

Як вяла ў дзіцячы сад...
А цяпер —
Мужчына сталы,
Лепшы гвардыі салдат.
Вось ён выпрастаўся,
Прама
Ў вочы глянуў.
Быццам сон:
— Не забыт наш бацька, мама.
Часці ўсёй вядомы ён.
— Што ты, сынку? —
Пабялела,
Ўся дрыжыць, як кволы ліст:
«Дзе ён, воін пасівелы,
Смелы аўтамабіліст?
З невядомасці мо нейкай
Да жыцця вярнуўся ён?
Мо насустрач ёй па рэйках
Праімчаўся эшалон,
Ды не мог сысці,
Не мог ён
Адгукнуцца нават ёй —
Ці бязрукі, ці бязногі,
Пакалечаны вайной?..»
— Супакойся, мама, сілы
Для жыцця паберажы...
— Дзе ж наш бацька, сынку мілы?
Не шкадуй мяне, скажы!
Сын глядзіць у бок пагоркаў,
А прад ёю — нейкі дым.

Нейкі ком у горле горкі:
Не, камбат не стаў сівым.
Ён такі ж, як быў прыгожы,
Малады — ідзе ў паход
І глытае пыл дарожны,
П'е дажджы каторы год.
Сын на могілках на брацкіх
Імя бацькі адшукаў.
Прад сябрамі па-салдацку
Ён маёру чэсць аддаў.
Расшпіліў салдацкі кіцель
І на ўвесь вялікі свет
Так сказаў:
— Вось ён — глядзіце —
Бацькі-воіна партрэт!
Прымацоўваю к граніту,
Каб ён бачны быў усім
І героем незабытым
У страі ішоў сваім.—
Гэткай мужнасці салдацкай
Пазайздросціць кожны б змог.
Побач —
Маці, сын і бацька —
Першы раз былі утрох.
Маці знае ўсё.
Навошта
Турбаваць сынка свайго?
Палявая з часці пошта
Будзе слаць лісты яго.

## 10

Там, за шэраю брамай,
Дом над Шпрэе-ракой.
Мне нясуць тэлеграму
З пошты той палявой.
Развітаўшыся з сынам
Ля вайсковых варот,
Зноўку едзе Марына
У родны домік, на ўсход.
Да Берліна — з Берліна —
Дзесяць дзён і начэй.
Колькі станцый, Марына,
Ты праедзеш яшчэ!
Колькі ўбачыш прастораў
І крутых берагоў,
Покуль вернешся «двору»
Да паўстанку свайго!
Тут была пераправа,
Вір кіпеў пад рукой.
А вунь
Стала Варшава
Прыгажуняй якой!
Над вадою павіслі
Кроны ціхіх ракіт.
А шырокая Вісла
Б'ецца ў шэры граніт.
Ля свайго ж ля парога
Нават сцежка шырэй.
Рэкі — тыя ж дарогі,

Толькі ззяюць ярчэй.
І шумяць бурна хвалі,
А замест цягнікоў
Па іх цягнуцца ўдалеч
Мноства тысяч плытоў.
Часам рэчка ўзарвецца —
Чаек чуецца крык,
Па вадзе плыт нясецца,
Нібы хуткі цягнік.
І заўжды чалавеку
Трэба трапіць дамоў,
Як да мора тым рэкам,
Што цякуць між дуброў.
— Добра ў іншых краінах,
Дома ж лепей заўжды.
Кліча зноўку Марыну
Сіні Лес малады.
Дзе дуброва бяскраю
Медным звонам гудзе,—
Сінявокага краю
Не забудзе нідзе.
Тут, за Оршаю роднай,
У бары векавым
Жыць да старасці згодна
На паўстанку лясным.
Заўтра выйду на золку
Я да рэек стальных
І сустрэну сяброўку
Між людзей дарагіх.

Хай паўстанак мінаюць
На пуцях цягнікі.
Заўтра возьме — я знаю —
Зноў Марына сцяжкі.
Хай нясе сваю службу,
Кліча сына ў свой дом.
Мы любоў нашу, дружбу
Да канца зберажом.
Самай лепшай, прызнацца,
Я лічу між навук:
Так любіць сваю працу,
Як Марына Дацук.
Я душою праз вёрсты
Ёй насустрач лячу.
Адну з стрэлачніц простых
Зноўку ўбачыць хачу.
Мужна, смела, адважна
Ўсю адольваць бяду.
І калі яна скажа —
Я заўсёды прыйду.
Хай між дрэў, пасівелых
Ад халодных вятроў,
Разыходзяцца стрэлы
І сыходзяцца зноў.

*1970—1971*

# ЗМЕСТ


***Пройдзе люты... . . . . . . . . . . 5
Дыханне вясны . . . . . . . . . . . . 6
***Даўно адгрымелі гарматы... . . . . . . 7
Сыноўняе . . . . . . . . . . . . . . 8
Чакаючы паштоўкі... . . . . . . . . . 10
Родны край . . . . . . . . . . . . . 11
На сваёй паралелі... . . . . . . . . 13
Імёны ў страі . . . . . . . . . . . 14
Франтавому кінаапаратару . . . . . . 16
Салдат з Душанбе . . . . . . . . . . 17
Дзе сонца ўздымалі з руін... . . . . . 19
Помнік уЦіргартэне . . . . . . . . . 21
За ціхім Одэрам . . . . . . . . . . 23
Над магілай баявога сябра . . . . . . 25
Майскі салют . . . . . . . . . . . . 27
Курган бяссмерця . . . . . . . . . . 29
Астраном на ракеце . . . . . . . . . 31
Шлях без прывалу . . . . . . . . . . 32
***Між гор зялёных... . . . . . . . . 34
Нараджэнне будзёнаўкі . . . . . . . . 35
У летнім лагеры . . . . . . . . . . . 36
На граніцы . . . . . . . . . . . . . 37
Зямля герояў . . . . . . . . . . . . 39
Мой горад . . . . . . . . . . . . . 41
У пачатку веку . . . . . . . . . . . 43
На радзіме . . . . . . . . . . . . . 44
***У слаўным, нялёгкім паходзе... . . . . 45
На манеўрах «Дзвіна» . . . . . . . . 46
Ода «Кацюшы» . . . . . . . . . . . . 48
Сляды на Месяцы . . . . . . . . . . 50

***Былінай, а не марай... . . . . . . . . . 51
Памір . . . . . . . . . . . . . . . 52
Кветкі з Вахшскай даліны . . . . . . . 54
Гронкі глогу . . . . . . . . . . .. 56
Асенняя краска . . . . . . . . . . . 57
Ласі . . . . . . . . . . . . . . . 58
Купалава таполя . . . . . . . . . . 59
Малое дрэўца . . . . . . . . . . . 61
Маё Прыдняпроўе . . . . . . . . . . 63
Першы буквар . . . . . . . . . . . 64
Песня адгукнецца . . . . . . . . . . 65
Сіняе вока зямлі . . . . . . . . . . 67
На крутой лесвіцы . . . . . . . . . 68
Воблачка . . . . . . . . . . . . . 69
Алеандры . . . . . . . . . . . . . 70
Паляўнічы . . . . . . . . . . . . . 71
Вышывальшчыца . . . . . . . . . . . 73
Зорка шчасця . . . . . . . . . . . 74
Першая вясна . . . . . . . . . . . 75
Птушаняты пакідаюць гнёзды . . . . . . 77
Балада пра гарніста . . . . . . . . . 78
Героі Чарнамор'я . . . . . . . . . . 81
Нашы барыкады . . . . . . . . . . . 82
Красавіцкая песня . . . . . . . . . . 84
Салдат пакалення . . . . . . . . . . 86
Не здадзеныя вышыні . . . . . . . . . 87
Твая спадчына . . . . . . . . . . . 89
Сасна над Дняпром . . . . . . . . . 90
Ветравыя шляхі *(паэма)* . . . . . . . . 93

**Прыходзька П.**

Не здадзеныя вышыні. Вершы і паэма. Мн., «Беларусь», 1972.

128 с. 5000 экз. 39 к.

У новай кнізе змешчаны вершы апошніх год — працяг размовы паэта з сучаснікамі, былымі салдатамі, аддanымі сынамі Радзімы. У вершах і паэме «Ветравыя шляхі» адчуваецца подых часу, подых грозных незабыўных дзён, калі вызначалася чалавечая годнасць, прыгажосць душы савецкага чалавека.

$\frac{7\text{-}4\text{-}3}{150\text{-}72}$ Бел2 П 85

На белорусском языке

*Петр Федорович Приходько*

НЕ ОТДАННЫЕ ВЫСОТЫ

Издательство «Беларусь» Государственного комитета Совета Министров Белорусской ССР по печати. Минск, Ленинский проспект, 79.

Рэдактар М. Ваданосаў. Мастак М. Пракапенка. Мастацкі рэдактар І. Славянін. Тэхнічны рэдактар Т. Сокал. Карэктар А. Глушчанка.

АТ 12957. Здадзена ў набор 18/X 1971 г. Падп. да друку 15/XII 1971 г. Тыраж 5000 экз. Фармат $60\times90^1/_{32}$. Папера друк. № 1. Ум. друк. арк. 4. Уч.-выд. арк. 3,69. Зак. 1582. Цана 39 кап.

Друкарня «Чырвоны друкар» Дзяржаўнага камітэта Савета Міністраў Беларускай ССР па друку. Мінск, зав. Калініна, 12.